ДЗВІНСКІ ЎЗГОРАК

*Кроч на свой родны,
дзвінскі ўзгорак,
каб глядзець
у будучую сінь*

**ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА ВІЦЕБСКАГА РАЁНА, №16 (121)
КАСТРЫЧНІК 2020 ГОДА**

ПРАТЭСТ

ДЕТЕЙ ГЛАВЫ ВИТЕБСКА ЗАДЕРЖАЛИ

В течение месяца в Минске задержали двоих сыновей Вадима Зарянкина, главы Витебского горисполкома.

Вадим Зарянкин вступил в должность председателя Витебского горисполкома в феврале 2020 года. До этого он возглавлял областной Комитет госконтроля. 20 августа Зарянкин участвовал в провластном митинге "За Беларусь".

Сын мэра Филипп Зарянкин признаётся, что, несмотря на должность отца и политические разногласия с этим связанные, у них с братом хорошие отношения с родителями.

— Мать и отец очень обеспокоены происходящим, волнуются за нас. Отец рвался приехать в Минск, когда меня задержали, но это бы никак не помогло. Несмотря на разные мнения в семье, родители нас поддерживают, — рассказывает Филипп. — Мы с братом пытались отца переубедить как-то, дискутируем с ним. Но находим не компромиссы, а, скорее, поводы не спорить. Часто касаемся политических тем, но прекращаем обсуждение на "кульминации", чтобы не ссориться.

Сын градоначальника пока не берётся прогнозировать, отразится ли как-то задержание его и брата на работе отца. Мать Филиппа и Владимира более 25 лет работает в Беларусбанке.

— А как у вас с братом сформировалась такая гражданская позиция? Вы открыто выступаете в соцсетях за честные выборы, против насилия.

— У меня уже давно такая позиция, у брата — ещё раньше. Несправедливость, очевидная неграмотность менеджмента страны, непопулярные экономические, политические решения привели страну к тому, где мы сейчас находимся. Не заметить это может только слепой. Каждый сам думает, что делать: молчать, ничего не делать или высказываться. Мы с братом решили не молчать, — поясняет Филипп.

Филиппа Зарянкина задержали 23 сентября, в день инаугурации Александра Лукашенко, а его брата Вадимира — 13 октября. В момент задержания оба не участвовали в протестах.

— Меня задержали 23 сентября приблизительно в 11 вечера. Акции протеста тогда не было, я проходил через оцепление на Немиге. Спросил ещё у милиционера, можно ли идти. Разрешили. А другой силовик взял меня под руки и задержал, — вспоминает Филипп.

— А как и за что задержали вашего брата?

— Тоже непонятно. Но похоже на целенаправленное задержание. Мой брат 12 октября около 11 часов вечера поехал в магазин за продуктами по просьбе жены. Возле магазина "Рига" к его машине подбежали 15 силовиков, разбили боковое стекло автомобиля, брата заставили выйти, положили на землю лицом в асфальт и потом увезли в РУВД, — рассказывает Филипп.

Суд наказал Филиппа Зарянкина 13 сутками административного ареста за участие в несанкционированной акции. Их Филипп провёл в ЦИП на Окрестина и в ИВС в Жодино.

— Отбывание проходило по-разному. Много общался с людьми в камерах, с милицией, которая охраняла. Кто-то из охраны угрожал, кто-то, наоборот, шёл на уступки, — описывает Филипп.

— А они знали, что вы сын витебского мэра?

— Да, все об этом знали. Но это работало для меня в худшую сторону, никак не помогало. Дали кличку "мэр". Общались со мной часто хуже, чем с другими заключёнными.

Брата Филиппа, Владимира Зарянкина, отпустили из ИВС в Жодино 14 октября. Всё это время с ним не могли связаться ни родственники, ни адвокат. Что вменяется Владимиру, также до сих пор неизвестно. 23 октября его дело рассмотрит суд.

Филиппу в октябре исполнится 28 лет. Он окончил мехмат БГУ, работал в Витебском благотворительном обществе, помогал домам ребёнка, детдомам, хоспису. Два года назад Филипп устроился на работу в IT-сфере.

Вадимиру 32 года, он работает в посольстве США в Минске, занимается программами по обмену. В посольстве США Евроради сказали, что не располагают свидетельствами о каких-либо противоправных действиях их работников.

«Еврорадио»

ПЕРАСЬЛЕД

З СІЗА ВЫЙШЛІ КАЗАКЕВІЧ І ЛАЗАРАЎ

14 кастрычніка ў Першамайскім судзе Віцебску судзьдзя Міхаіл Юрчанка разгледзеў дзьве адміністрацыйныя справы ў адносінах да журналіста "Белсату" Зьміцера Казакевіча і адну ў адносінах да апэратара "Белсату" Вячаслава Лазарава. Да суду журналісты тры содні правялі ў СІЗА. Суд праходзіў у анляйн-рэжыме праз Skype.

11 кастрычніка незалежныя журналісты амаль адначасова былі затрыманыя на перакрыжаваньні праспектаў Будаўнікоў і Перамогі ў раёне лядовага палацу. Паводле пратаколу Казакевіча абвінавацілі ў актыўным удзеле ў несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве, а Лазарава – у пікетаваньні.

Сваёй віны ані Лазараў, ані Казакевіч не прызналі. Маўляў, намерваліся выконваць свае прафэсійныя абавязкі, але былі затрыманыя яшчэ да пачатку іх выкананьня.

У судзе ў якасьці сьведкаў былі апытаныя два супрацоўнікі Першамайскага РАЎС прапаршчыкі Цітоў і Нікіфараў. У затрыманьні журналістаў яны ня ўдзельнічалі, а рапарты склалі са словаў тых, хто затрымліваў. Сказаць нешта па-сутнасьці ніхто зь іх ня здолеў.

Адвакат Дзяніс Ястраб прадставіў суду запіс з асабістага тэлефону дзяўчыны, якая ў момант затрыманьня журналістаў знаходзілася на аўтобусным прыпынку і зафіксавала акалічнасьці арышту. Яе таксама апыталі ў судзе. Яна пацьвердзіла праўдзівасьць свайго запісу і паведаміла, што Вячаслава Лазарава затрымалі наўпрост на астраўку бясьпекі.

Адвакат заклікаў суд спыніць справу паводле ч.1, арт.23.34 КаАП за адсутнасьцю ў дзеяньнях сваіх падабаронных складу правапарушэньня. Дасьледаваныя матэрыялы і апытаныя сьведкаў пацьвердзілі, што ніякага ўдзелу ў масавым мерапрыемстве журналісты не прымалі і адміністрацыйных правапарушэньняў не зьдзяйсьнялі.

Судзьдзя Юрчанка пагадзіўся зь меркаваньнем адваката і пастанавіў справы ў адносінах Казакевіча і Лазарава спыніць. Ад імя суду Юрчанка прынёс прабачэньне за дзеяньне органу, які вёў адміністрацыйны працэс.

Сьледам Юрчанка разгледзеў у дачыненьні да Казакевіча яшчэ адну справу па ч.1, арт. 23.34 КаАП, якая вярнулася ў суд пасьля дапрацоўкі. Тады ў адным з эпізодаў пратэстнага шэсьця, якое адбылося 6 верасьня, на перакрыжаваньні Леніна і Замкавай Зьміцер Казакевіч апынуўся ў натоўпе грамадзянаў, якія супрацьстаялі дзеяньням міліцыянтаў. На нейкі момант Казакевіч трапіў у самы вір падзеяў і ўшчыльную зьліўся з пратэстоўцамі. Гэтая акалічнасьць дала падставу міліцыянтам абвінаваціць журналіста ў актыўным удзеле ў несанкцыянаваным мерапрыемстве. Маўляў, журналіст не апрануты ў камізэльку журналіста, не працуе, як журналіст, і хапае рукамі іншых удзельнікаў сутыкненьня.

Зьміцер патлумачыў, што гэты эпізод непрацяглы па часе. У тым месцы вузкія ходнікі і ўхіліцца ад судакрананьня з натоўпам не было магчымасьці.

Адвакат зьвярнуў увагу на тое, што інфармацыя выкладзеная ў пратаколе, не знайшла свайго аб'ектыўнага пацьверджаньня. Казакевіч прысутнічаў там, як журналіст, і відэазапіс цалкам не засьведчвае яго вінаватасьць ва ўдзеле ў несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве.

Гэтым разам з аргументамі адваката судзьдзя не пагадзіўся, прызнаў Зьміцера Казакевіча вінаватым і прысудзіў яму тры содні арышту, залічыўшы час адміністрацыйнага затрыманьня ў якасьці адбыцьця пакараньня.

Пасьля выхаду з СІЗА ў кватэры Зьміцера Казакевіча міліцыянты правяліператрус. Па непацьверджанай інфармацыі забралі на дасьледаваньне два ноўтбукі, два сістэмныя блёкі, флэшкі. Шукалі парушэньне арт. 22.9 КаАП.

Ян Сведка

СУДОВЫ КАНВЕЕР

СУДЫ ЗА АКЦЫІ ПРАТЭСТУ

13 верасьня ў судзе Першамайскага раёну Віцебску судзьдзі Міхаіл Юрчанка і Вераніка Барысава вынесьлі шэраг судовых рашэньняў па адміністрацыйных справах паводле арт 23.34 КаАП за ўдзел у несанкцыянаваных шэсьцях.

6 верасьня ўрач-стаматоляг Уладзімер Балясаў прайшоў у складзе калёны віцебскіх пратэстоўцаў ад ГЦ "Марка-сіці" да вул. Праўды. У адным з эпізодаў апэратыўнай відэаздымкі ягоны твар быў зафіксаваны апэратарам, што і дало магчымасьць абвінаваціць Уладзімера ва ўдзеле ў несанкцыянаваным шэсьці паводле ч. 1 арт. 23.34 КаАП.

Уладзімер Балясаў пагадзіўся са зьместам пратаколу, але вінаватым сябе не прызнаў. Лекар палічыў, што Канстытуцыя і Усеагульная дэкларацыя правоў чалавека даюць грамадзяніну права на негвалтоўнае выказваньне сваёй нязгоды з вынікамі сёлетніх выбараў і тым,

(працяг на стар. 2)

СУДОВЫ КАНВЕЕР

(пачатак на стар. 1)

што адбываецца ў краіне.

“Я разумеў адказнасьць, якая мяне чакае, але палічыў, што рызыка панесьці пакараньне за адміністрацыйнае правапарушэньне – меншае зло, чым здзелка з уласным сумленьнем”, – патлумачыў Балясаў.

Улічыўшы акалічнасьці адміністрацыйнай справы, сямейныя і іншыя абставіны, судзьдзя Міхаіл Юрчанка вынес Уладзімеру Балясаву папярэджаньне.

Адміністрацыйную справу, датычную ўдзелу ў несанкцыянаваным мерапрыемстве дырэктара прыватнага прадпрыемства Максіма Жукава, таксама разглядаў судзьдзя Міхаіл Юрчанка. 6 верасьня Жукаў прагульваўся па вуліцах гораду ў складзе арганізаванай калёны. Праваахоўнікі палічылі, што сваімі паўторнымі дзеяньнямі ён парушыў заканадаўства і быў абвінавачаны па ч.3 арт. 23.34 КаАП. Свой удзел у шэсьці Жукаў не адмаўляў, але пераконваў, што актыўна сябе не паводзіў, а проста гуляў па горадзе. Праўда, час ад часу скандаваў лёзунг: “Сабачку!”. Вінаватам сябе ня лічыць і ў далейшым не выключае, што будзе гэтак жа прагульвацца ў кожны з сямі дзён тыдня.

Сьведка Жукава Жанна Іванова засьведчала, што бачыла Жукава ў раёне вуліцы Праўда. Паводзіў той сябе стрымана, лёзунгаў не выгукваў, сьцягамі не размахваў.

Судзьдзя Юрчанка выслухаў сьведку, агучыў матэрыялы справы, пасьля чаго палічыў даказаным удел Жукава ў несанкцыяваным мерапрыемстве ды аштрафаваў яго на 45 базавых велічыняў(1215 рублёў).

У гэты ж дзень у Першамайскім судзе судзьдзя Вераніка Барысава вынесла папярэджаньне за ўдзел у несанкцыянаваным шэсьці 6 і 30 верасьня пэнсіянэрцы Маргарыце Ермаковіч.

Ян Сьведка

ШТРАФЫ ЗА МІРНЫ ПРАТЭСТ

У судах Кастрычніцкага і Першамайскага раёнаў Віцебску 9 кастрычніка разглядаліся адміністрацыйныя справы ў дачыненні ўдзельнікаў мірных маршаў. Віцябляне Аляксей Тамілаў, Юлія Барсукова і Сафіі Цярэнцьевай былі прызнаныя вінаватымі ў правапарушэнні паводле арт. 23.34 КаАП і аштрафаваныя.

У судзе Кастрычніцкага раёну Віцебску за ўдзел у не дазволеным уладамі шэсці 6 верасня (ч.1 арт. 23.34 КаАП) судзілі віцябляніна Аляксея Тамілава. Ягоную справу разбіраў суддзя Уладзімір Царыкаў.

Паводле пратаколу, Аляксей Тамілаў удзельнічаў у несанкцыянаваным шэсці па маршруце «вул. Леніна – Б. Хмяльніцкага – Праўды – Смаленская». Ён нібыта рухаўся ў кампаніі грамадзянаў, якія неслі бел-чырвона-белыя сцягі і скандавалі лозунгі «Ганьба!», «Лукашэнка, сыходзь!» ды іншыя.

Аляксей патлумачыў, што гэта быў ягоны першы ўдзел у масавым мерапрыемстве. Загадзя яго не планаваў, а пра тое, што шэсце не мела дазволу ад уладаў, не ведаў. Свой удзел у шэсці патлумачыў нязгодай з вынікамі сёлетніх выбараў. Перасоўванне па вуліцах гораду ўспрымаў хутчэй як прагулянку ў кампаніі людзей.

У якасці сведкі ў судовым паседжанні суддзя Царыкаў апытаў дырэктара прыватнага прадпрыемства Максіма Жукава. Ён засведчыў, што сустрэў Тамілава і нейкі час яны разам з іншымі грамадзянамі гулялі па горадзе. Ніякіх сцягоў ці плакатаў Аляксей пры сабе не меў і лозунгаў не выгукваў.

Тым не менш, суддзя Уладзімір Царыкаў прызнаў Аляксея Тамілава вінаватым ва ўчыненні адміністрацыйнага правапарушэння і аштрафаваў на 16 базавых велічынь (432 рублі).

У гэты ж дзень у судзе Першамайскага раёну Віцебску за ўдзел у несанкцыянаваным шэсці 23 жніўня 18-гадовая студэнтка Сафія Цярэнцьева была аштрафаваная на 2 базавыя велічыні (54 рублі). Такое рашэнне было прынятае суддзём Міхаілам Юрчанкам.

Актывістку Юлію Барсукову суддзя Першамайскага суду Вераніка Барысава за актыўны ўдзел у несанкцыянаваным шэсці 11 жніўня аштрафавала на 25 базавых велічынь.

У той дзень Юлію разам з мужам і кіроўцам таксоўкі, які іх падвозіў, каля ГЦ «Амега» затрымалі і амапаўцы. Іх змясцілі ў ІЧУ, адкуль Юлію забрала хуткая, а муж і таксіст адседзелі ў ізалятары па двое содняў.

Якаў Дрозд

АСУДЗІЛІ ВАЗОЧНІЦУ

Суд Віцебскага раёну 16 кастрычніка аштрафаваў на 7 базавых велічынь (189 рублеў) жыхарку аграгарадку Кастрычніцкая 56-гадовую Валянціну Крыштопенка – інваліда першай групы. Жанчыну абвінавацілі ва ўдзеле ў несанкцыянаваных маршах пратэсту, якія прайшлі ў Віцебску 4 і 11 кастрычніка.

Міліцыя склала на Валянціну Крыштопенка два пратаколы: за ўдзел у несанкцыянаваных вулічных шэсцях 4 і 11 кастрычніка. У пратаколах гаворыцца, што жанчына «трымала транспарант», «выкрыквала лозунгі».

Валянціна Крыштопенка пагадзілася, што ўдзельнічала ў шэсцях, але сваю віну не прызнала.

«Я маю права на свабоду выказвання свайго меркавання. Гэта права мне дае Канстытуцыя. Я прыйшла на марш, каб мяне пачулі. Выбары былі незаконныя, і я супраць гвалту ў дачыненні да людзей, можна нават сказаць, генацыду. Да таго часу, пакуль будуць у нашай краіне біць людзей, я буду выходзіць на мірныя дэманстрацыі, чаго б мне гэта ні каштавала», – сказала жанчына.

Каб трапіць на мірныя дэманстрацыі, жанчыне давялося ехаць са свайго аграгарадку ў Віцебск на таксі. Потым, па яе словах, яна далучалася да пратэстоўцаў і прасіла незнаёмых людзей на маршы, каб тыя везлі яе на інвалідным вазку наперадзе калоны.

На судзе былі прагледжаныя міліцэйскія відэазапісы з двух апошніх нядзельных мірных маршаў пратэсту ў Віцебску. Валянціна Крыштопенка пазнала сябе на ўсіх роліках.

«Калі вы ў мяне спытайце, хто арганізатар, лялькавод гэтых маршаў, я адкажу: гэта нашае сумленне», – заявіла жанчына суддзі Міхаілу Зубеню.

«На ўсіх відэа вы знаходзіцеся наперадзе калоны. Гэта была вашая асабістая ініцыятыва – быць на чале? Або так выпадкова атрымалася?» – пацікавіўся суддзя.

«Гэта была мая ініцыятыва. Па-першае, нязручна ісці за кімсьці – «падразаюцца» ногі. А па-другое, я папрасілася наперад, каб абараніць сабою хоць некалькіх хлопцаў на маршы, каб на іх не нападалі з дубінкамі. Хочацца верыць, што, убачыўшы чалавека ў калясцы, міліцыя не будзе так страшна нападаць і выкарыстоўваць газ», – патлумачыла спадарыня Валянціна.

Суддзя угледзеў у дзеяннях Валянціны Крыштопенка парушэнне часткі 1 артыкулу 23.34 КаАП: «Удзел у дадзеных несанкцыянаваных мерапрыемствах вы бралі свядома, разумелі, што вакол адбываецца, паводзілі сябе досыць актыўна. Суд лічыць неабходным накласці пакаранне ў межах санкцыі артыкулу, набліжаных да мінімальнага параметру: 7 базавых велічынь, альбо 189 рублёў».

Раней Валянціна Крыштопенка распавядала TUT.BY аб тым, што з 11 гадоў пакутуе рэўматоідным артрытам, які пашкоджвае суставы.

«У мяне – чатыры пратэзы. Я магу і стаяць, і хадзіць. Але ёсць абмежаванні. Хаджу я з асцярогай, не спяшаючыся, стараюся выбіраць добрую, роўную дарогу. Стаяць доўга таксама не магу – саджуся. На дэманстрацыі ў Віцебску я была на вазку: там траўманебяспечна, ці мала хто штурхне. Да таго ж шмат і хутка хадзіць я не магу», – расказала Валянціна Крыштопенка.

Валянціна распавяла, што ёй не было страшна: «Мне зрабілі 4 аперацыі, таму я ўжо мала чаго баюся ў сваім жыцці. А вось тое, што адбываецца ў нашай краіне, – гэта сапраўды страшна. Таму я і выйшла на мірны пратэст. Калі не могуць выйсці дужыя мужыкі, дык выходзяць жанчыны. Калі не выходзяць дэсантнікі, дык пайду я – інвалід. На маршы я спецыяльна напрасілася наперад – каб міліцыя не хапала першую сьэпку. Можна сказаць, я выйшла, каб іх абараніць».

Таццяна Мацьвеева
Tut.by

ДАНОС

«1937-Ы ГОД НЕЙКІ!»

Два тыдні таму віцяблянку Алену Каваленка аштрафавалі на 10 базавых велічынь за ўдзел у мірным шэсці 13 верасня. Фатаграфуючы матэрыялы сваёй справы, жанчына натрапіла на ананімны данос на яе чалавека, з якім мае стасункі на працы. Мужчына называе сябе ў ананімцы былым камандзірам узводу віцебскага спецназу.

«Вы, калі ласка, мяне не падстаўляйце. Пра мяне ніхто не мусіць ведаць. Я былы супрацоўнік МУС, інфармацыя носіць аператыўны характар, майце на ўвазе, што гэтая жанчына – лідар, актывістка мітынгаў-майданаў у Віцебску. Не супраць пайсці на дзяржпераварот», – піша аўтар заявы, чыё прозвішча міліцыянты нават не парупіліся зацерці.

«Так, я ведаю яго па працы, гэта інжынер па пажарнай бяспецы Кавальчынскі Юрый Анатольевіч. Якраз мяне на пачатку верасня правяраў. І мы тады яшчэ счапіліся наконт выбараў. Ну такая спрэчка невялікая атрымалася. Але ўвечары пачаў пісаць мне ў вайберы і павучаць мяне ў духу прапаганды. Раздрукоўка той размовы таксама фігуруе ў маёй справе», – расказвае Алена Каваленка.

Яна прызнаецца, што была шакаваная, калі натрапіла на ананімку ў матэрыялах справы.

«Гэта быў шок! Адна справа паразмаўляць з чалавекам прыватна і падзяліцца сваімі поглядамі. Я ніколі не хаваю сваіх поглядаў, такая мая пазіцыя. Але калі асабістую перапіску нясуць у міліцыю… Гэта як сталінскія часы вярнуліся! 37-ы год нейкі», – кажа Алена.

«Настроеная вельмі агрэсіўна супраць прэзідэнта РБ, супраць расейскай мовы, усіх рускабеларускіх славян. Прыхільніца ўз'яднання з Еўропай», – гэтак характарызуе Алену ў сваім лісце ў міліцыю ваенны пенсіянер і былы спецназавец, як ён сябе называе.

Алена выказвае меркаванне, што акурат гэты данос, які трапіў у міліцыю 9 верасня, стаў прычынай таго, што ёй зацікавілася супрацоўнікі МУС, сачылі за ёй 13 верасня падчас шэсця, а потым склалі пратакол паводле арт. 23.34, па якім суд прызнаў яе вінаватай і аштрафаваў.

Больш за тое, гэты «ананімны электронны зварот» быў накіраваны намеснікам начальніка УУС аблвыканкаму Шаховічам у РАУС Першамайскага раёну «для разгляду па сутнасці» (дакумент таксама маецца ў справе).

«Ананімныя даносы не мусяць быць нормай у дэмакратычным грамадстве. Так, яны могуць выкарыстоўвацца органамі, каб не дапусціць з боку экстрэмісцкі настроеных асоб крымінальных учынкаў. Але калі па ананімным даносе праводзіцца праверка ў дачыненні грамадскай актывісткі, то гэта – хуткі шлях да палітычных рэпрэсій, якія праводзіліся НКУС СССР у 30-40 гады XX-га стагоддзя», – мяркуе віцебскі праваабаронца Леанід Свецік.

Зміцер Міраш
“Віцебская вясна”

АБ’ЯВА

Каб атрымліваць кожны нумар газеты “Дзвінскі Узгорак” паведаміце рэдакцыі аб гэтым. Калі не жадаеце атрымліваць газету, то патэлефануйце.


Калі парушаны вашы правы спажыўца, працаўніка, то даем эфектыўныя парады па абароне правы і пошуку бясплатных юрыстаў. Звяртайцеся на адрас газеты “Дзвінскі Ўзгорак”.

Наша газета стала размяшчацца на партале http://kamunikat.org, дзе зацікаўленыя грамадзяне могуць яе спампаваць яшчэ да з'яўлення газеты на паперы.

АЗБУКА ПАЛІТАЛОГІІ

КОЛЬКІ ЯШЧЭ ПРАЦЯГНЕЦЦА РЭВАЛЮЦЫЯ Ў БЕЛАРУСІ?

Рэвалюцыя, як і развод, з’яўляецца не падзеяй, а працэсам. Улетку 2020 года рэвалюцыя ў Беларусі стартавала. Як доўга яна працягнецца?



Беларусам трэба будзе навучыцца жыць без уладнай вертыкалі. Гэта задача прынцыпова іншага ўзроўню складанасці. Яна не палітычная, а сацыякультурная.

Так званыя «выбары» паслужылі ў Беларусі трыгерам (падзеяй, якая запускае пэўную эмацыйную рэакцыю), што перавёў беларускае грамадства з паўсоннага стану ў стан палітычнага ўзбуджэння.

Схаваныя на працягу чвэрці стагоддзя праблемы ў лічаныя дні агаліліся. Але адэкватнай мовы іх апісання пры гэтым не ўзнікла ні ва ўлады, ні ў пратэстоўцаў.

«Мы ведаем, мы разумеем, мы…»

Адзінае, на што аказалася здольная ўлада з усёй сваёй прапагандысцкай абслугай, — гэта выцягнуць з запаснікаў тэорыю змовы. Да 9 жніўня, з-за адсутнасці празаходняга кандыдата ад апазіцыі, на ролю галоўнага змоўшчыка была прызначаная «наша Расія». «Вагнераўцы», што не зразумела, якім ветрам былі занесеныя ў Сінявокую, аказаліся ў той момант вельмі нават дарэчы. Калі б іх не было, іх варта было б прыдумаць.

5 жніўня ў інтэрв’ю украінскаму журналісту Дзмітрыю Гардону адзіны палітык (АП) прадэманстраваў сваю кампетэнтнасць: «Мы бачылі, з кім яны звязаныя. Мы кантралявалі іх цалкам. Мы ведаем, з кім яны стэлефаноўваліся, адкуль атрымлівалі каманды — з Расіі, хто даваў гэтыя каманды. Мы ўжо бачылі, што тут чымсьці смажаным пахне. Мы разумелі ў кантэксце міжнародных стасункаў, што нам спакойна жыць не дадуць».

Пасля 9 жніўня ўсе гэтыя «мы бачылі», «мы кантралявалі», «мы ведаем» і «мы разумеем» страцілі сваю актуальнасць. Расія, у адрозненне ад Захаду, вынікі «выбараў» прызнала.

Давялося тэрмінова разварочвацца праз левае плячо на 180 градусаў, ды працягваць пры гэтым дэманстраваць гораду і свету сваю кампетэнтнасць: «...мы выразна бачым суб’ектаў гэтага працэсу, іх правадыроў і памагатых. Тактыка арганізатараў будавалася паводле класічнага амерыканскага падручніку каляровых рэвалюцый. Гэта ўсім вядомы Джын Шарп. Цяпер мы можам азірнуцца назад і дэталёва разабраць усе этапы сцэнару па знішчэнні нашай краіны, якому мы, на шчасце, не дазволілі рэалізавацца, і не дазволім».

Мы, мы, мы... вось такія мы малайцы!

Гэты геапалітычны разварот нагадаў мне анекдот пра інжынера, які пераканаўча тлумачыў прычыну росту паказчыка на графіку. Калі ж яму заўважылі, што ён трымае графік дагары нагамі, ён гэтак жа пераканаўча пачаў тлумачыць прычыну зніжэння паказчыка.

Але ад анекдота прапаную перайсці да гістарычнага факта, які я запазычыў з кнігі палітычнага географа Дзмітрыя Арэшкіна «Джугафілія і савецкі статыстычны эпас»: «У 1929 г. СССР рыхтаваўся адзначыць пяцідзесяцігадовы юбілей І.В. Сталіна. Буйному тэарэтыку ваеннай справы Кліму Варашылаву даручаны ганаровы абавязак напісаць артыкул “Сталін і Чырвоная Армія”. Ён вельмі стараецца. І, мабыць, ад хвалявання дазваляе сабе недапушчальны для марксіста-ленінца промах. “У І. В. Сталіна, — піша Варашылаў, — памылак было менш, чым у іншых”. Трэба ж было ляпнуць такое! Дзякуй богу, тав. Сталін пры ўсёй загружанасці знайшоў час уважліва прачытаць тэкст і выратаваць гісторыю ад скажэнняў, а Варашылава — ад ганьбы. “Клім! Памылак не было. Трэба выкінуць гэты абзац”, — па-бацькоўску тлумачыць ён на палях рукапісу».

Ад прыроднай мудрасці да апоры на народ

Памылак не было. Іх не было, таму што іх не магло быць. Вось такая жалезная логіка. Гэта на загніваючым Захадзе палітыка — суцэльная чарада памылак. Нам жа з першага дня (варта адлічваць ад 10 ліпеня 1994 года) давялося рухацца адзіна правільным курсам.

Але дзе гарантыя правільнасці курсу? Не буду вынаходзіць ровар. У Беларусі хапае аўтарытэтных спецыялістаў. Старшыня Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук, доктар эканамічных навук, прафесар, акадэмік Уладзімір Гусакоў — адзін з іх. Сваё бачанне галоўнай асаблівасці беларускага шляху акадэмік не трымае ў сакрэце.

У Беларусі пасля развалу СССР пачыналася ўсё як ва ўсіх: адмова ад грамадскага сектара, насаджэнне прыватных парадкаў, страта кваліфікаваных кадраў, маштабная дэградацыя эканомікі і імклівае падзенне якасці жыцця.

«Пералом, — тлумачыць акадэмік, — наступіў у 1994–1995 гадах, калі прэзідэнтам краіны быў абраны А. Р. Лукашэнка», які коштам неверагодных намаганняў здолеў «спачатку прыпыніць дэградацыю і спаўзанне краіны ў прорву, а затым у гістарычна кароткія тэрміны павярнуць яе развіццё ў стваральнае рэчышча».

Геракл са сваімі 12 подзвігамі тут і побач не стаяў. Але Геракл быў сынам галоўнага з багоў-алімпійцаў Зеўса, у непасрэдным падпарадкаванні якога знаходзіліся неба, гром і маланкі. Максімум, на што герой грэчаскай міфалогіі аказаўся здольны — гэта накіраваць у «стваральнае рэчышча» воды ракі, якая працякала недалёка ад стайні цара Аўгія.

Мерацца характарыстыкамі з антычным героем — справа няўдзячная. Але хто сёння будзе адмаўляць, што Беларусь выклікае зайздрасць у суседзяў? Каму ў наш бурны час спадабаецца донар еўрапейскай стабільнасці, што мірна калышацца ў стваральным рэчышчы?

Аднак многія раілі як мага хутчэй пакончыць са старым укладам. Што ж утрымала АП ад рэформаў, якія вядуць Беларусь да разбурэння, а ў перспектыве — да поўнага знікнення? На думку акадэміка Уладзіміра Гусакова, асабістыя якасці АП. Прывяду далёка не поўны іх пералік: «прыродная мудрасць і інтуіцыя, выключная працаздольнасць і праніклівасць, а яшчэ — апора на народ і велізарны давер народа, які захаваўся да гэтага часу».

Парадак б’е клас

Калі трыгер, што спрацаваў 9 жніўня, дазволіў уладзе выцягнуць з запаснікаў старую як свет тэорыю змовы, то ўзбуджанаму грамадству ён дапамог па-новаму зірнуць на палітычныя міфы, якія фарміраваліся чвэрць стагоддзя.

Пра тое, што грамадская свядомасць заражаная міфамі, як камп’ютар вірусамі, я пісаў неаднаразова. У айчынным міфалагічным эпасе па-за канкурэнцыяй быў міф пра «Плошчу», або міф пра «100 тысяч».

Практыка — крытэр ісціны, і яна міф пра «Плошчу» разбурыла. Вера ў «Плошчу» — гэта вера ў магчымасць за кошт аднаразовага намагання прачнуцца ў іншай краіне. Але так не бывае. Паглядзіце на Украіну. У 2004 годзе «Аранжавая рэвалюцыя» перамагла. Ура, таварышы! Але ці перамагла насамрэч?

Спачатку неабходна ўсвядоміць праблему. Насуперак уяўленням многіх беларусаў, праблема не зводзіцца да змены персоны на вяршыні ўладнай вертыкалі. Вертыкаль — гэта атрыбут мінулага стагоддзя, атрыбут савецкага варыянта індустрыялізацыі з яе масавай вытворчасцю... узбраенняў.

Сучасны дынамічны свет аддае перавагу арганізацыі грамадства не па вертыкалі, а па гарызанталі. Ён не мае патрэбы ў правадырах, здольных, нібы Кашпіроўскі, поглядам спыняць дэградацыю нацыянальных эканомік і падзенне жыцця народаў.

Беларусам трэба будзе навучыцца жыць без уладнай вертыкалі. Гэта задача прынцыпова іншага ўзроўню складанасці, і, па вялікім рахунку, яна не палітычная, а сацыякультурная.

Каб увайсці ў сучаснасць, беларусам хапае чалавечага капіталу (адукацыі). Галоўная праблема — дэфіцыт сацыяльнага капіталу, г. зн. здольнасці да сумесных дзеянняў.

Парадак б’е клас. У якасці ілюстрацыі гэтай ісціны спашлюся на вядомы гістарычны прыклад: сотня французскіх кавалерыстаў не баялася сотні мамелюкоў; трыста французаў бралі верх над такой жа колькасцю мамелюкоў, а 1000 разбівала 1500.

І яшчэ адзін прыклад, гэтым разам запазычаны ў расійскага эканаміста Аляксандра Аузана: «Гэта гістарычна вядомы факт пра тое, як Міхаіл Сперанскі, рускі рэфарматар, вярнуўся з Еўропы і сказаў: “Гасудар, у іх установы лепшыя за нашыя, а ў нас людзі лепшыя”».

Гэта наш выпадак. У іх (ва ўладзе) установы лепшыя. Адзін ЦВК чаго варты! Не ў апошнюю чаргу дзякуючы яму мы сёння маем тое, што маем.

* * *

Рэвалюцыя, як і развод, з’яўляецца не падзеяй, а працэсам. Улетку 2020 года рэвалюцыя ў Беларусі стартавала. Як доўга яна працягнецца? Адказ на гэтае пытанне будзе залежаць ад нашай здольнасці ствараць установы — структуры грамадзянскай супольнасці.

(скарочана)

Сяргей Нікалюк
“Новы Час”

ЗВАРОТ

БЕЛАРУСЬ АЖЫЛА І АБАВЯЗКОВА ПЕРАМОЖА!

Старшыня Рады БНР Івонка Сурвілла напісала калонку з нагоды апошніх заяваў уладаў і падзей у Беларусі. Прыводзім яе тэкст цалкам з аўтарскай арфаграфіяй.

Сілавыя структуры, падпарадкаваныя Аляксандру Лукашэнку, гатовыя страляць у свой мірны законапаслухмяны народ. Пра гэта прамым тэкстам цяпер кажа намеснік міністра Караева.

За чвэрць стагодзьдзя аўтарытарызму ў Беларусі мы, здаецца, маглі б стаць звыклыя да ўсяго. Але я не магу стрымаць свайго шоку і абурэньня гэтай заявай.

Бо адметнасьцю цяперашняга беларускага пратэсту стала неверагодныя мірнасьць і мудрасьць, якія праявіў народ Беларусі. Гэтай мірнасьцю, мудрасьцю, яскравай творчасьцю беларусаў, якія мы бачым увесь гэты час, захапляецца ўвесь сьвет.

Мы, тысячы беларусаў і нашчадкаў беларусаў, раскіданыя па ўсім сьвеце, ганарымся сваёй беларускасьцю цяпер больш, чым калісь яшчэ. Іншыя народы, хто зь няведаньня часам думаў, што беларусы радыя свайму сумнаму лёсу, цяпер глядзяць на Беларусь па-новаму, пера-жываюць за беларусаў і гана-рацца імі.

І тое, што выклікае павагу і захапленьне ўсяго сьвету — тое і выклікае ярасьць і нянавісьць тых, хто ведае, што іхны час незваротна мінуў. Яны могуць колькі заўгодна суцяшаць сябе штучнымі лічбамі з афіцыйных вынікаў выбараў. Яны будуць ненавідзець, будуць хлусіць і пагражаць з тэлевізару, будуць біць і страляць.

Беларускі народ — у кроку ад свабоды. У кроку ад таго, за што змагаліся пакаленьні нашых продкаў, у тым ліку героі Слуцкага збройнага чыну, стагодзьдзе якога мы будзем адзначаць праз крыху больш як месяц.

Усе нашыя малітвы, усе нашыя думкі ў гэтыя дні зь Беларусяй.

Зь Беларусяй — усе нашыя сьлёзы абурэньня жорсткасьцю карнікаў.

Як і нашыя сьлёзы радасьці, калі бачым тысячы і тысячы людзей штотыдзень на вуліцах Беларусі: старых і маладых, жанчынаў і мужчынаў, жыхароў Менску і жыхароў маленькіх мястэчак.

Рэвалюцыя адбываецца перадусім не ў адміністрацыі, а ў душах і сэрцах людзей. Гэтая рэвалюцыя адбылася. Гэтая рэвалюцыя адбываецца штодзень, штораз, як беларусы выходзяць да сябе ў двор, усьміхаюцца сваім суседзям, сьпяваюць, выходзяць разам на марш пад нашым сьцягам — у супольнай радасьці, у супольным узьнёслым пачуцьці прыналежнасьці да свае зямлі, у супольнай празе справядлівасьці і праўды.

Беларусь ажыла і абавязкова пераможа. Не спыняйцеся, ня бойцеся, і ведайце: за вамі праўда і за вамі ўвесь сьвет ад Эўропы да Канады і Аўстраліі.

Жыве Беларусь!

Івонка Сурвілла
“Новы Час”

ЕЎРАПАРЛАМЕНТ

ПА ЎЗРОЎНІ ГВАЛТУ ЎЛАДЫ БЕЛАРУСІ ПЕРАЎЗЫШЛІ ГЕРМАНІЮ 1933 ГОДА Ў ДВА РАЗЫ

«Тыя зверствы і гвалт, якія дэманструе цяперашняя ўлада ў Беларусі, проста жудасныя і супастаўныя толькі з фашысцкім рэжымам у Германіі 1930-х гадоў», — заявіў кіраўнік юрыдычнай камісіі праваабарончага грамадскага аб'яднання «Беларускі Хельсінкскі Камітэт» (БХК) Гары Паганяйла, выступаючы 16 кастрычніка ў Еўрапарламенце падчас абмеркавання сітуацыі ў Беларусі, паведамляе «Радыё Рацыя».

Згодна з ацэнкай Гары Паганяйлы, па ўзроўні гвалту ўлады Беларусі сёння «перавысілі Германію 1933 года ў два разы».

«Улада разарвала дамову паміж грамадствам і дзяржавай, яна не забяспечвае захаванне правоў грамадзян, але пры гэтым дадзеная поўная свабода сілавым структурам. У спробах утрымаць уладу ўрад ідзе на самыя жорсткія і злачынныя метады барацьбы з іншадумствам», — канстатаваў Паганяйла.

Праваабаронца нагадаў, што паранейшаму не распачата ніводнай справы па фактах прымянення гвалту супрацоўнікамі сілавых структур да ўдзельнікаў дэманстрацый, у той час як у дачыненні да пратэстоўцаў адкрыта ўжо 400 крымінальных спраў. «Гэта проста не паддаецца ніякаму асэнсаванню, — падкрэсліў Паганяйла. — У гэтай сітуацыі мы вымушаныя прасіць Еўрапарламент і ўсе структуры Еўрасаюза прадумаць і прыняць адпаведную пастанову аб пошуку і прымяненні юрыдычных інструментаў, якімі мы маглі б скарыстацца, каб прыцягнуць да крымінальнай адказнасці як індывідуальна супрацоўнікаў сілавых структур, так і арганізацыі».

Прадстаўнік БХК растлумачыў, што гаворка ідзе пра магчымасць «выкарыстання ўніверсальнай крымінальнай юрысдыкцыі». «Гэты інструмент закладзены ў многіх крымінальных і крымінальна-працэсуальных кодэкса краін Еўропы, ЗША, Канады і іншых цывілізаваных краін, якія падтрымліваюць барацьбу са злачынствамі супраць чалавецтва, — сказаў ён. — Пры наяўнасці палітычнай волі, пры наяўнасці жадання ў структур, да якіх мы сёння апелюем, стварыць адпаведныя каардынацыйныя цэнтры для юрыстаў тых краін, дзе можна прымяніць універсальную крымінальную юрысдыкцыю, каб яна пачала дзейнічаць».

У якасці прыкладу Паганяйла адзначыў, што сёння прыблізна 200 беларускіх грамадзян, у тым ліку пацярпелыя ад жорсткасці і гвалту сілавікоў, знаходзяцца ў Літве, Польшчы, Украіне.

«Украіна распачала адну з такіх спраў, Польшча і Літва таксама прадумваюць варыянты, — адзначыў праваабаронца. — Нам бы хацелася, каб гэтая праца прасоўвалася хутчэй, каб мы мелі сур'ёзны інструмент для барацьбы з беспакаранасцю беларускіх уладаў».

«Што гэта дасць? Калі мы здолеем распачаць справы, па якіх будуць выдадзеныя ордэры на арышт і перададзеныя Інтэрполу, то гэта хоць у нейкай ступені можа пацягнуць змену сітуацыі ўнутры Беларусі, — удакладніў праваабаронца. — Многія з сілавога блока зразумеюць, што беспакаранасць заканчваецца, што рана ці позна яны паўстануць перад судом і атрымаюць пакаранне. Вядома, я разумею, што патрэбныя арганізацыйныя і матэрыяльныя намаганні, але гэта таго вартае».

Сённяшнія слуханні ў Еўрапарламенце арганізаваныя камітэтам ЕП па замежных справах і падкамітэтам па правах чалавека сумесна з дэлегацыяй па сувязях з Беларуссю і Парламенцкай асамблеяй Усходняга партнёрства (Еўранест).

“Радыё Рацыя”

ЗАЯВА

“ЛУКАШЕНКО И ЛУКАШИЗМ — АБСОЛЮТНОЕ ЗЛО"

В ситуации, когда не действует Закон, когда любого могут похитить и убить, искалечить и надругаться, я вынужден обратиться с этим публичным Заявлением. "Я, Павел Знавец, депутат последнего законно-избранного легитимного парламента Республики Беларусь — Верховного Совета Республики Беларусь 13-го созыва, член Центрального Комитета БСДП(Грамада), заявляю следующее.

В Республике Беларусь в массовом порядке продолжаются произвольные нападения на мирных граждан со стороны представителей силовых структур. Они сопровождаются избиениями, задержаниями и пытками, которые приводят в том числе к смерти людей.

В настоящее время, попав в отделение милиции, любой гражданин чувствует себя абсолютно бесправным и беззащитным — подобно скотине, которую везут на убой.

В Республике Беларусь практически не действует Закон. Акциями террора и насилия над людьми руководят, как правило, представители особых силовых подразделений МВД и КГБ Беларуси, таких как ОМОН, «Алмаз» и др.

Эти спецподразделения предназначены для борьбы с терроризмом и организованной преступностью. Однако в настоящее время они терроризируют мирное население и используются для жестокого подавления мирных акций протеста, в ходе и после которых мирных граждан и случайных прохожих захватывают либо похищают. Над захваченными и похищенными людьми сотрудники этих спецподразделений устраивают пытки и издевательства. То, что произошло со мной — яркое тому свидетельство.

4 сентября 2020г. примерно около 15 часов по минскому времени группа неустановленных лиц в чёрной камуфляжной форме, в масках-балаклавах, скрывающих их лица, с аббревиатурой «ОМОН» на спине, внезапно выскочила из микроавтобуса, припаркованного у тротуара напротив здания магазина «Алеся» по пр. Победителей, 3 в г. Минске.

Налётчики окружили и прижали к стеклянным витринам здания группу мирных граждан, часть из которых была с флагами, флажками, шариками и другой атрибутикой в цветах национального исторического бело-красно-белого флага Республики Беларусь. Среди окружённых граждан оказался и я.

Люди в чёрной униформе и масках, скрывающих лицо, действовали агрессивно, выхватывали людей поодиночке из толпы и насильно проводили их в стоявший неподалёку микроавтобус. Таким образом и я был задержан….

На велосипеде я прибыл на пр. Победителей в г. Минске 04. 10.2020г, надеясь пообщаться с наиболее активными гражданами Беларуси и подарить им партийные флажки . Это одна из форм партийной работы. Как депутат последнего легитимного парламента Республики Беларусь — Верховного Совета и как активист Белорусской социал-демократической партии я знал, что по выходным дням в центр г. Минска выходят на прогулки и шествия против фальсификации выборов и узурпации власти бывшим президентом А. Лукашенко сотни тысяч граждан Беларуси с активной жизненной позицией. Я также принадлежу к их числу.

Поэтому я действовал в полном соответствии с Законом, своими убеждениями и даже тем пожеланием, которое как-то публично высказал бывший президент Беларуси А.Лукашенко о необходимости активизировать партийное строительство в нашей стране…

…На моё замечание о том, что флажки с изображением цветка розы и надписью «БСДП» являются официально зарегистрированной в Министерстве юстиции Республики Беларусь символикой Белорусской социал-демократической партии(БСДП), в которой я состою, он грубо толкнул меня лицом в пол микроавтобуса и заломал руки за спину. После этого он достал пластиковую стяжку-жгут и связал мне кисти рук за спиной, причём затянул жгут так, что кровь перестала поступать в ткани ладоней и пальцев рук. Боли в области кистей рук и онемение мягких тканей ладоней я ощущаю до сих пор, т.е. спустя несколько дней после случившегося….

На протяжении всего времени моего нахождения в Советском РУВД г. Минска человеческие субъекты в масках и чёрной униформе руководили всеми действиями в отношении задержанных, угрожая применить силу в случае любого неповиновения, а также командовали находившимся в помещении РУВД иным милицейским персоналом.

Поздно вечером 4 октября 2020г. меня и других задержанных граждан препроводили в автозак для доставки из Советского РУВД г. Минска в изолятор для временного содержания задержанных граждан(ИВС), находящийся на территории тюрьмы в г. Жодино …

В пути следования автозака в г. Жодино в нём произошла какая-то неполадка. Водитель остановил машину для устранения неисправности, забыв при этом выключить двигатель. И я во второй раз чуть было не задохнулся, на этот раз от газа, исходившего от работающего двигателя автозака, который поступал в мой отсек через узкую вентиляционную щель- решетку в потолке. ..

Спустя несколько минут поломку в автозаке устранили, он тронулся с места и в мой отсек через вентиляционную решетку- отверстие в потолке поступил свежий воздух. Теперь я воочию представляю, как задохнулся в автозаке и впоследствии умер при доставке в госпиталь г. Гомеля 25 —летний Александр Вихор.

В тюрьме г. Жодино со мной и другими административно задержанными гражданами тюремные надзиратели обращались как с уголовниками: ставили на растяжку, постоянно кричали и угрожали применить силу в случае малейшего неповиновения. Так, меня и других задержанных граждан, в частности, гнали подобно стаду скота почти бегом по узким, длинной примерно в полкилометра подземным петляющим коридорам тюрьмы, ведущим в помещение ИВС.

…5 октября 2020г. днём в ИВС на территории тюрьмы в г. Жодино после очередных грубых унизительных процедур и стойки на растяжке меня доставили в комнату неподалёку от моей камеры, где и состоялось рассмотрение моего административного дела. Дело рассматривал прибывший из г. Марьина Горка Пуховичского района Минской области судья в присутствии секретаря-женщины.

К моему удивлению, судья повёл процесс корректно: после установления данных моей личности перечислил мои права как участника процесса и т.д. Я этим воспользовался, сделал соответствующее заявление о моём произвольном задержании, фальсификации протокола задержания, который я не подписал и применении пыток, которые едва не закончились для меня смертельным исходом . Судебное разбирательство было отложено и перенесено на 15 октября 2020г., начало процесса в 15 ч. 20 мин. с вручением мне соответствующей повестки.

Вышеописанные преступные, унижающие человеческое достоинство действия сотрудников силовых структур, особенно ОМОНа, являются пытками. Пытки, жестокое и унизительное обращение с людьми применяется в Республике Беларусь в отношении мирных граждан, задержанных, подчёркиваю, не за совершении особо тяжкого преступления, а произвольно либо за совершение административного правонарушения. Такое просто недопустимо в европейском государстве. Этому должен быть положен конец. Бывший президент А. Лукашенко и лица из его окружения, с ведома и при потворстве которых всё это происходит, должны быть немедленно отстранены от занимаемых должностей, арестованы и преданы суду…

После всего пережитого мне уже нет смысла бояться смерти, которая всё равно неизбежно придёт. Но нужно верить в победу Добра над Злом. Лукашенко и лукашизм как система в Республике Беларусь есть абсолютное зло. Поэтому всем ответственным людям нужно осознать, что если в ближайшее время Лукашенко не будет отстранён от власти, это может стать трагедией мирового масштаба. Ведь весь цивилизованный мир, следящий за событиями в Беларуси, увидит и ощутит торжество зла.

…Сегодня моя персональная судьба, как и судьба каждого выходящего на мирный протест беларуса — это в известной степени слепок и отображение будущего Беларуси, Европы и всего цивилизованного мира.

(скарочана)

Павел Знавец.
belaruspartisan.by/blogs/znavec

Заснавальнік і рэдактар: Смолікаў Канстанцін Эдуардавіч

Адрас рэдакцыі: г. Віцебск, вул. 1-я Сенненская д.5,
Тэл. +375-29-218-98-38, e-mail: kas_vit@tut.by
Газета выдаецца з лютага 2014 г.

Падпісана да друку 18.10.2020 у 15.10
Наклад: 290 асобнікаў.
Выдаецца адзін-два разы на месяц на беларускай і расійскай мовах.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Друкуецца пры падтрымцы аднадумцаў.
Распаўсюджваецца бясплатна дабраахвотнікамі.